3. Паводле верша Алеся Ставера, Радзіма — *азёрны рабінавы край*. Вобразна апішыце, якім вам уяўляецца Беларускае Палессе.
4. Паразважайце, ці абавязкова, каб любіць Беларусь, *трэба ў розных краях пабываць*. Чаму чалавеку бывае цяжка без роднага краю?
5. Паслухайце аўдыязапіс песні «Жураўлі на Палессе ляцяць...» на музыку Ігара Лучанка ў выкананні ансамбля «Песняры». Якія думкі абудзіла ў вас песня? Які зрокавы малюнак узнік пасля яе праслухоўвання?
6. Уявіце: вам трэба пазнаёміць замежных гасцей са сваёй Радзімай, і тыя папрасілі паслухаць песні пра Беларусь. Ці падыходзіць, на вашу думку, твор Ігара Лучанка і Алеся Ставера для таго, каб быць песенным візітным карткай Беларусі? Абгрунтуйце свой адказ.
7. Прыгадайце вядомыя песні на словы беларускіх паэтаў. Паспрабуйце назваць іх аўтараў і выканаўцаў.
8. Падрыхтуйце малюнак або фотасюжэт да песні «Жураўлі на Палессе ляцяць...».
9. Вывучыце верш Алеся Ставера «Жураўлі на Палессе ляцяць...» на памяць.
10. Прачытайце артыкул «Песня», выканайце заданні па тэме.



# Алесь БАЧЫЛА

О мой любы родны край,
Ты — прыгожы, нібы рай.
І нідзе ў другіх краях
Шчасным быць не змог бы я.

*Ніл Гілевіч.*

Алесь (Аляксандр) Мікалаевіч Бачыла (1918—1983) — беларускі паэт, драматург, перакладчык, крытык. Нарадзіўся ў вёсцы Лешніца Пухавіцкага раёна Мінскай вобласці.

«У Лешніцы праходзіла маё маленства, — пазней успамінаў паэт. — Улетку цэлымі днямі бавіўся на рэчцы, а бліжэй да во-



Правообладатель Национальный институт образования

сені, калі паспявалі ягады і з'яўляліся першыя грыбы, прападаў у лесе. І толькі зіма з яе завеямі і маразамі надоўга заганяла ў хату. Тады ўжо вечарамі слухалі мы, як старэйшая сястра чытала кніжкі ці расказвала цікавыя казкі пра вадзянікоў ды чарцей... У школу пайшоў рана, у 6 гадоў, — карцела хутчэй навучыцца чытаць. Праўда, спачатку маці не адпускала. Але я не адступіўся ад свайго — хоць і без кніжак, а пайшоў. І... о нечаканасць! — мяне запісалі ў першы клас...

Неяк вычытаў, што набіраюцца студэнты ў аўтатранспартны тэхнікум. Прыёмных экзаменаў тады не было — і я ўжо амаль лічыў сябе студэнтам першага курса. Аднак у спіске прынятых маё прозвішча так і не трапіла. Мне было трынаццаць гадоў, а ў тэхнікум прымалі з пятнаццаці... Белпедтэхнікум аб'явіў дадатковы набор. Я ўхапіўся за гэта, як за выратавальны круг. Пры прыёме дакументаў ніхто нават не звярнуў увагі на мой узрост».

Пазней Алесь Бачыла скончыў Мінскі настаўніцкі інстытут, выкладаў беларускую мову і літаратуру ў школах на Міншчыне. Пісаў таксама творы для дзяцей.

Вершам Алеся Бачылы ўласцівы сюжэтнасць, напеўнасць, меладычнасць, многія з іх пакладзены кампазітарамі на музыку і сталі вядомымі песнямі.

Назавіце некалькі асацыяцый-азначэнняў, якія ўзнікаюць у вашым уяўленні, калі чуеце слова *Радзіма*. Ці можна вызначыць, якія з іх найбольш важныя і значныя?

## Радзіма мая дарагая...

Радзіма мая дарагая,
Ты ў шчасці жаданым жыві.
Я сэрцам табе прысягаю
У шчырай сыноўняй любві.

На рэках шырокіх і нівах,
Заводах, будоўлях — наўсцяж[1]

---

[1] *Наўсця́ж* — ва ўсіх напрамках, навокал.



Правообладатель Национальный институт образования

Народ наш працуе руплівы,
І край узвышаецца наш.

Навокал жыццё расцвітае —
І песня ўзлятае сама:
Мне лепей ад роднага краю
Нічога на свеце няма.

Чужое зямлі нам не трэба,
Пачуцці ва ўсіх нас адны:
Мы хочам, каб мірнае неба
Не знала пажараў вайны.

Мы дружбы народам жадаем
І шчырай братэрскай любві.
Радзіма мая дарагая,
Красуйся і ў шчасці жыві!

1. У якіх радках заключана асноўная думка верша? Зачытайце іх.
2. Растлумачце выкарыстанне ў вершы слова *прысягаю*.
3. Як вы разумееце выраз *край узвышаецца наш*?
4. Пракаменціруйце словы паэта: *чужое зямлі нам не трэба*.
5. Паслухайце песню «Радзіма мая дарагая...», якую лічаць адным з песенных сімвалаў Беларусі (музыка Уладзіміра Алоўнікава). Раскажыце пра сваё ўспрыманне мелодыі песні, падзяліцеся ўласнымі эмоцыямі.
6. Якога лёсу і якой будучыні жадае паэт Радзіме і свайму народу?
7. Што, на ваш погляд, аб'ядноўвае вершы Алеся Ставера «Жураўлі на Палессе ляцяць...» і Алеся Бачылы «Радзіма мая дарагая...»? Выкарыстайце інтэрнэт-рэсурсы і падрыхтуйце прэзентацыю ілюстрацый (рэпрадукцый карцін або мастацкіх фотаздымкаў) да гэтых вершаў.
8. Падрыхтуйце вуснае выказванне «Радзіма пачынаецца з...».
9. Прачытайце артыкул «Песенны сімвал Беларусі», выканайце заданне па тэме.



Правообладатель Национальный институт образования